УДК 159.9

*В. І. Сазыкіна, факультэт міліцыі*
*Навуковы кіраўнік: С. В. Венідзіктаў,*
*начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

# АДАПТАЦЫЯ ДЗЯЎЧЫН-КУРСАНТАЎ ДА НАВУЧАННЯ ВА ЎСТАНОВЕ АДУКАЦЫІ СІСТЭМЫ МУС У КАНТЭКСЦЕ "ШКАЛЫ ТРЫВОЖНАСЦІ"

Псіхалагічная адаптацыя да навучання — працэс засваення ўмоў, норм, каштоўнасцей новага сацыяльнага асяроддзя, уключэнне ў сталыя формы службовага ўзаемадзеяння, рашэнне розных задач, якія патрабуюць асаблівых валявых намаганняў. Вучэбнае асяроддзе ў сістэме МУС характарызуецца, найперш, перавагай групавых відаў дзейнасці, жорсткай рэгламентацыяй жыццядзейнасці, высокім узроўнем знешняга кантролю, спецыяльнай формай адзення, звужэннем кола сацыяльных кантактаў і, як следства, цяжкасцю сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі курсантаў.

Асновай адлюстраванага ў артыкуле даследавання сталі матэрыялы псіхалагічнай дыягностыкі працэсу адаптацыі курсантаў да навучання ў Магілёўскім інстытуце МУС (2016 г.). У якасці аб'екту даследавання мы абралі кантынгент дзяўчын-курсантаў (30 чалавек першага і другога гадоў навучання), для якіх пытанні першаснай адаптацыі да спецыфічнага адукацыйнага асяроддзя з'яўляюцца актуальнымі. Дзяўчаты павінны ў сціснутыя тэрміны перабудаваць свой распарадак дня, засвоіць этыку службовых узаемаадносін. Найбольшыя цяжкасці выклікаюць строгая дысцыпліна, неабходнасць захавання распарадку дня, наяўнасць жорсткай сістэмы «начальнік / падначалены». Некаторыя дзяўчыны толькі ва ўмовах інстытута пачынаюць засвойваць навыкі вядзення хатняй гаспадаркі і самаабслугоўвання. Дадзеныя цяжкасці вядуць да росту стомленасці і напружання, у шэрагу выпадкаў — да нервовых зрываў і міжасобасных канфліктаў.

У першую чаргу, з выкарыстаннем методыкі «шкалы трывожнасці» Кондаша быў вызначаны ўзровень трывожнасці навучэнцаў, які карэлюе з узроўнем адаптацыі. Асаблівасць шкалы такога тыпу складаецца ў тым, што рэспандэнт ацэньвае не наяўнасць альбо адсутнасць у сябе якіх-небудзь перажыванняў, сімптомаў трывожнасці, а аналізуе сітуацыю ў цэлым з пункту гледжання таго, наколькі яна можа выклікаць трывогу. Пры гэтым вызначаецца вобласць рэчаіснасці, аб'екты, якія з'яўляюцца асноўнымі крыніцамі трывогі.

Варта ўлічваць, што трывожнасць адчуваюць і тыя, хто адказна ставіцца да вучобы, грамадскага жыцця, затрачваючы для гэтага значны аб’ём псіхічнай энергіі, перажываючы стрэсы.

Наша даследаванне паказала, што 100 % дзяўчын-курсантаў, якія праходзяць навучанне ў Магілёўскім інстытуце МУС, маюць нармальны ўзровень трывожнасці ў навучальных і міжасобасных адносінах. Аднак толькі 10 % маюць нармальны ўзровень у грамадскіх адносінах, 88 % курсантаў на агульным узроўні праяўляюць празмерны спакой (такі ж паказчык адзначаецца ў сферы самаацэнкі), толькі ў 12 % апытаных самаацэнка знаходзіцца на нармальным узроўні. Прычынамі такога становішча, на наш погляд, з’яўляюцца няўпэўненасць у сабе, неразуменне таго, што адбываецца, унутраная агрэсія ў адказ на знешнія раздражняльнікі. У трактоўцы шкалы трывожнасці неабходна ўлічваць значную ступень суб’ектыўнасці адказаў, ідэалізацыю навучэнцамі сваіх магчымасцей, наўмыснае скажэнне імі інфармацыі.

Адэкватны ўзровень трывожнасці ў працэсе адаптацыі да навучання адыгрывае важную ролю ў эмацыйна-валявой рэгуляцыі і ў цэлым з’яўляецца істотным унутраным фактарам, які абумоўлівае фарміраванне адаптыўнага рэсурсу асобы. Фактарам, які ўскладняе адаптацыю дзяўчын-курсантаў, з’яўляецца гендэрная сацыялізацыя, у прыватнасці, гендэрныя стэрэатыпы мужчын-афіцэраў і юнакоў-курсантаў. Гэтыя стэрэатыпы ўплываюць на адносіны паміж курсантамі рознага полу, на стыль паводзінаў і зносін, вызначаюць асаблівасці адаптацыі да ўмоў навучання.

Акрамя названых праблем, якія вырашаюцца праз развіццё самадысцыпліны і самавыхавання, існуе кола пытанняў, звязаных з сістэмай узаемаадносін. Не заўсёды і не ўсе дзяўчыны-курсанты знаходзяць сваё месца ў калектыве, для многіх працэс станаўлення займае 8–14 месяцаў. Мае патрэбу ў вырашэнні і пытанне пра ўспрыманне дзяўчынамі сябе як супрацоўнікаў міліцыі. Відавочна гэта праяўляецца ў сітуацыях, калі курсанты знаходзяцца за межамі навучальнай установы ў службовай форме. У дзяўчат у сувязі з падобнымі сітуацыямі часцей за ўсё ўзнікаюць канфлікты з аднагодкамі з ліку грамадзянскай моладзі.

Пытанні псіхалагічнай адаптацыі дзяўчын-курсантаў звязаны таксама з праблемай прафесійнай дэфармацыі, якая праяўляецца ў маскулінізацыі жанчын, у распаўсюджванні агрэсіўных мадэлей паводзінаў. Агрэсіўнасць як рыса паводзінаў не толькі назіраецца ў дзяўчын-курсантаў, але і мае тэндэнцыю да росту. Біялагічнымі перадумовамі росту агрэсіўнасці лічыцца наяўнасць акцэнтуацый (крайняя норма паводзінаў) асобы. Больш за палову акцэнтуацый належыць «актыўным» тыпам — гіпертымнаму, істэроіднаму і эпілептоіднаму, канфліктнасць якіх абумоўлена асаблівасцямі нервовай сістэмы. Другую частку

складаюць акцэнтуацыі «пасіўнага» тыпу — лабільнага (эмацыйнага) і псіхастэнічнага, для якіх агрэсія не характэрна. У навучальныя ўстановы МУС часцей паступаюць дзяўчыны з больш актыўным тыпам акцэнтуацыі, бо яны больш настойлівыя, упартыя ў дасягненні мэты, г. зн. валодаюць якасцямі, неабходнымі для паступлення.

Такім чынам, паспяховай адаптацыі спрыяюць такія якасці асобы, як: а) камунікабельнасць, якая дазваляе паспяхова ўваходзіць у новыя калектывы; б) хуткае вызначэнне свайго месца ў сумеснай дзейнасці; в) здольнасць да самакрытыкі, веданне і ўлік уласных слабых і моцных якасцей пры выбары стылю дзейнасці; г) цэласнасць асобы, уменне планаваць свае дзеянні і паводзіны, а затым дадзены план выконваць; д) уменне ў разнастайных умовах (часта нестандартных) знаходзіць магчымасці для раскрыцця сваёй арганізаванасці, актыўнасці [1]. Шмат у чым паспяховасць далейшай прафесійнай дзейнасці ў праваахоўнай сферы залежыць ад асаблівасцей першаснай адаптацыі асобы да працэсу навучання.

**Спіс асноўных крыніц**

1. Андреева, И. Н. Управление кадрами. Руководство для персонала и топ-менеджмента / И. Н. Андреева. — СПб. : БХВ-Петербург, 2012. — 416 с.